Э. А. Мурзіч

# БЕЛЕТРЫСТЫЧНЫЯ ЭЛЕМЕНТЫ Ў МАЛОЙ ПРОЗЕ М. ЗАРЭЦКАГА (НАВЕЛЫ «БЕЛЬ», «НА ЧЫГУНЦЫ» І «КВЕТКА ПАЖОЎКЛАЯ»)

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, г. Мінск;*
*elka.karamelka21@yandex.by;*
*нав. кір. – Л. Д. Сінькова, д-р. філал. навук, праф.*

У артыкуле разглядаюцца навелы «Бель» (1924), «На чыгунцы» (1926) і «Кветка пажоўклая» (1926) Міхася Зарэцкага (1901–1937). Творы аўтара карысталіся і карыстаюцца вялікай папулярнасцю сярод чытачоў, што ў вялікай ступені звязана з умелай пабудовай інтрыгі пры дапамозе белетрыстычных мастацкіх сродкаў. У тэксце артыкула вылучаюцца характэрныя для белетрыстыкі элементы і праводзіцца аналіз навел «Бель», «На чыгунцы» і «Кветка пажоўклая» з мэтай характарыстыкі функцый гэтых элементаў. На базе вызначаных рыс белетрыстыкі робяцца вывады пра манеру пісьма М. Зарэцкага, а іменна пра тое, з'яўляюцца яго навелы белетрыстыкай ці белетрызаванай прозай, у якой перавага аддаецца раскрыццю ідэі і праблематыкі.

***Ключавыя словы:*** белетрыстычныя элементы; драматычная і меладраматычная інтрыга; эфект «пазнавання рэальнасці»; белетрыстычная фабула; псіхалагічная дэталь.

Белетрыстыка – літаратура так званага другога раду, якая не з'яўляецца ўзорнай, але мае пэўныя вартасці.

Міхась Зарэцкі – класічны беларускі пісьменнік 1920–30-х гг. Аднак ён вядомы яшчэ і тым, што ўмеў выказваць сур'ёзны змест праз інтрыгі – элемент белетрыстыкі. Прычым выкарыстанне белетрыстыкі было для пісьменніка сродкам раскрыцця сур'ёзнага зместу.

Вылучым наступныя рысы белетрыстыкі, на якія мы будзем звяртаць увагу пры аналізе твораў М. Зарэцкага: паглыбленне ў чалавечую псіхалогію дзеля стварэння драматычнай або меладраматычнай інтрыгі; стварэнне эфекту «пазнавання рэальнасці»; імкненне да сюжэтнасці; выкарыстанне дэталі для стварэння нечаканага эфекта.

Звернем увагу на найбольш цікавыя аўтарскія прыёмы, з дапамогай якіх М. Зарэцкі стварае інтрыгу.

Навела «Бель» прысвечана тэме «новага кахання» на фоне той маштабнай ломкі традыцыйнай маралі, што адбывалася ў савецкія 1920-я гг. Галоўны герой – Даніла Чаборскі – мае жонку і двух дзяцей, але раптам пачынае зносіны з рабочай Ганнай Матузовай. У выніку Даніла разводзіцца з жонкай,

але ў Ганны ўжо новае захапленне. Фінал трагічны: галоўны герой гіне ў завеі.

Ужо напачатку твора М. Зарэцкі кідае чытачу намёк на развязку твора.

«Бель… Першая бель – прывітанне доўгачаканай гасцюхі-зімы…

– Весела, радасна спатыкаць першы снег!

– Чаму?

– Можа, таму, што смерць прыроды ярка адзначае, быццам падкрэслівае жыццё чалавека?» [1, с. 170].

У гэтых радках мы бачым супярэчнасць з канцоўкай твора, бо бель стала прадвеснікам смерці героя. Магчыма, аўтар тым самым хацеў паказаць, што такі выбар спадарожніцы жыцця, які зрабіў Даніла, як і «новае каханне», з'яўляюцца згубнымі для чалавека. Такі тэкставы элемент падобны да «чэхаўскага ружжа», якое выкарыстоўваецца, каб зрабіць эфект нечаканасці ў фінале, што характэрна для белетрыстыкі.

Выдатна стварае М. Зарэцкі меладраматычную інтрыгу. Праз думкі галоўнага героя мы бачым напружанне ў яго сямейных зносінах; бачым, як зараджаецца новае каханне героя; бачым барацьбу ў душы Данілы паміж сумленнем і пачуццямі.

Вобраз Ганны Матузовай выяўлены не так дасканала, як вобраз Данілы. Яна хутчэй выконвае службовую ролю, з'яўляецца носьбітам пэўных якасцей і думак, супрацьлеглых думкам аўтара. Але менавіта на кантрасце з такой гераіняй мы бачым глыбіню вобраза галоўнага героя і больш ярка ўспрымаем узнятую аўтарам праблему.

Сваёй кульмінацыі навела дасягае ў момант суда па справе разводу паміж Данілам і яго жонкай. Няздольным аказаўся герой на тое, каб пазбыцца голасу свайго сумлення і з галавой паглыбіцца ў новае каханне. У выніку Даніла застаецца адзін і замярзае ў завеі.

Такім чынам, навела «Бель» будуецца на меладраматычнай лініі зносін, характэрнай для белетрыстычных твораў. Выразна прасочваецца аўтарскае паглыбленне ў псіхалогію галоўнага героя. Вобраз жа Ганны Матузовай толькі схематычны. Але ў творы раскрыта важная праблема: сутыкненне традыцыйнага і «новага», савецкага разумення сям'і, кахання, адказнасці чалавека за свае ўчынкі.

Сюжэт навелы «На чыгунцы» таксама звязаны з вобразамі людзей новай эпохі. Ён будуецца вакол знаёмства і адносін паміж бязногім салдатам Яўменам Гракам і дзяўчынай-бежанкай Надзеяй.

Аўтар стварае вельмі дакладны малюнак рэчаіснасці, забяспечвае эфект «пазнавання рэальнасці». Гэта максімальна набліжаныя да чытача эмоцыі ад выгляду жанчын, «якія ад бруду і цяжкой зморы сталі зусім падобныя адна да адной» [1, с. 290], і адчуванне кіслага паху вагона, і дзіўнае для дадзенай сітуацыі пачуццё тугі па доме.

Другая частка твора прысвечана знаёмству Яўмена і Надзеі. Галоўны герой бачыць боль і адзіноту дзяўчыны. Гэтыя пачуцці ў падсвядомасці Яўмена сталі нечым супольным для яго і Надзеі. М. Зарэцкі дакладна малюе адносіны паміж двума адзінокімі людзьмі, якія выпадкова знайшлі адзін аднаго ў жорсткіх умовах ваеннага часу.

У фінале аўтар робіць меладраматычны паварот: з-за драўлянай нагі Яўмен не паспявае сесці на адыходзячы цягнік сам, але закідвае туды Надзею. Паварот з раптоўным расстаннем з'яўляецца прадказальным белетрыстычным прыёмам. Аднак вобразнае выяўленне белетрыстычнай фабулы М. Зарэцкім настолькі таленавітае, што выклікае ў чытача і рэзанансныя эмоцыі, і працяглы роздум над цэлым сюжэтам як транслятарам рэчаіснасці.

Такім чынам, «На чыгунцы» – твор, які ўтрымлівае белетрыстычныя элементы ў сюжэтабудаванні. У ім ёсць тыповая белетрыстычная фабула і ёсць меладраматычны фінал. Аднак ёсць і тая праўда рэальнага жыцця, якая выклікае ў чытача глыбокае суперажыванне героям.

У цэнтры навелы «Кветка пажоўклая» лёс Марыны Гарновай, жанчыны, якая ў часы рэвалюцыі настолькі паддалася яе ідэі, што падпісала смяротны прысуд роднаму брату. Бацькі яе праклялі, чаго жанчына не змагла перажыць. Цэнтральным героем, з якім звязана разгортванне фабулы, з'яўляецца не Марына, а Алесь Булановіч, чалавек, які ў яе закахаўся.

Ужо ў самым пачатку Міхась Зарэцкі акружае Марыну суцэльнай таямнічасцю, але дае нам дэталь у яе знешнасці, якая намякае на трагедыю ў жыцці жанчыны. «Як усміхаецца, дык зморшчыкі збіраюцца праменьчыкамі, ахінаюць вочы ціхай, ласкавай прыветнасцю. Тады ў вачах знікае тая дзіўная палахлівая маркота…» [1, с. 321].

Развівае М. Зарэцкі і класічную для яго твораў меладраматычную лінію. Булановіч пачынае цікавіцца Гарновай, а тая – ім.

М. Зарэцкі вешае для чытачоў і «чэхаўскае ружжо». Так, Гарнова гаворыць Алесю: «А яшчэ могілкі я люблю… за іх спакой, цішыню… <…> Але чыгунка бліжэй мне, больш захапляе… Ведаеце што, я памру на чыгунцы…» [3, с. 333]. Так і адбываецца ў канцы твора.

Гарнова рэгулярна звяртае ўвагу Булановіча на тое, што яна доўга не працягне на гэтым свеце. Булановіч жа часам думае, што ўсё прыдумка Марыны. Але пасля жанчына нарэшце расказвае сваю гісторыю. Здзіўляе, што Алесь нібыта прымае яе становішча як належнае. Калі Марына адмаўляе яму ў шлюбе, Булановіч нават уздыхае з палёгкай: ён не змог бы выцягнуць жанчыну з яе псіхалагічнай багны. Разумее гэта і Гарнова, таму свядома кідаецца пад цягнік.

Нягледзячы на тое, што ў апавяданні ўмела ствараецца інтрыга, змест навелы «Кветка пажоўклая» намнога багацейшы па сэнсавай насычанасці, чым фармальная фабула. Навела пра чалавека, які так і не змог вярнуцца да душэўнай раўнавагі пасля вялікага ўзрушэння ў сваім жыцці. Але акрамя таго, навела пра тое, якімі нераўназначнымі бываюць пачуцці, як адзін чалавек, нават пры гарачай сімпатыі, не можа зразумець, што знаходзіцца ў душы другога.

Такім чынам, можна зрабіць выснову аб наяўнасці ў разгледжаных навелах элементаў паэтыкі, характэрных для белетрыстычных твораў. Гэта робіць прозу М. Зарэцкага магнетычна прыцягальнай для чытача. Аднак канцэптуальныя асновы мастацтва М. Зарэцкага настолькі глыбокія, яго ідэі настолькі актуальныя, што спадчына пісьменніка (белетрызаваная проза) заканамерна ўваходзіць у фонд беларускай літаратурнай класікі.

**Библиографические ссылки**

1. *Зарэцкі М.* Збор твораў: у 4 т. Мінск: Мастацкая літаратура, 1989. Т. 1 : Апавяданні.